**Д. І. Сергіеня**

# АКСІЯЛАГІЧНАЯ ПРАБЛЕМАТЫКА ДЗІЦЯЧАЙ ПРОЗЫ ЦЁТКІ І БІН СІНЬ

У апошнія гады значна пашырылася супрацоўніцтва паміж Кітайскай Народнай Рэспублікай і Рэспублікай Беларусь. Пры гэтым традыцыйная сістэма каштоўнасцей, якая доўгі час фарміравала асновы нацыянальнай ідэнтычнасці гэтых краин, аказваецца пад націскам шматлікіх выклікаў сучаснасці. Аналіз літаратурных традыцый Кітая і Беларусі на прыкладзе выбітных письменні Цёткі Бін Сінь і садзейнічае больш глыбокаму разуменню ўнутраных культурных працэсаў і спрыяе ўзмацненню дыялогу паміж краінамі.

Так, Цётка і Бін Сінь шмат увагі надаюць мастацкаму асэнсаванню такіх каштоўнасцей як справядлівасць, спачуванне, дабрата, узаемадапамога, цяга да ведаў і інш. Але ў аксіясферах абедзвюх пісьменніц ёсць і адрозныя рысы.

У зборніку «Першая чытанка для дзетак беларусаў» Цётка адлюстроўвае сельскае жыццё, адзначаючы важнасць працавітасці, узаемадапамогі і сціплага дастатку. Гэта ў першую чаргу датычыцца  апавяданняў «Нядзеля» і «Наша гаспадарка». Важнае месца займае тэма адзінства і ўзаемападтрымкі, прыкладам чаго з'яўляецца апавяданне «Мая вёска», дзе жыхары аб'ядноўваюцца, каб адкрыць школу з навучаннем на беларускай мове. Антыкаштоўнасці прадстаўлены ў казках «Журавель і чапля» – высмейвае гонар і ўпартасць, «З прыску ды ў агонь» – прагнасць і помсту, «Гутарка асока

з крапівою» – ганарыстасць і павярхоўныя меркаванні.

Адна з галоўных каштоўнасцяў, прадстаўленых у «Пісьмах да маленькіх чытачоў» Бін Сінь, – матчына любоў, якая апісваецца як універсальная пазачасавая сіла, якая фармтруе ідэнтычнасць чалавека, служыць апорай і накіроўвае на працягу ўсяго жыцця. Да ліку каштоўнасцей у мастацкай сістэме кітайскай пісьменніцы аднесены і дзіцячы светапогляд, які аўтар пазначае паняццем 童心 *'дзіцячая душа'* – гэта здольнасць бачыць свет чыста і непасрэдна. Таксама Бін Сінь шмат увагі надае асэнсаванню важнасці жыцця, сямейных сувязяў і традыцыйнай культуры.

Такім чынам, абедзве пісьменніцы ў сваёй дзіцячай прозе адлюстравалі агульначалавечыя каштоўнасці, але кожная з іх сканцэнтравалася на розных іх відах: Цётка – на сельскай суполцы і тых каштоўнасцях, якія дапамогуць дзіцяці лепш у ёй адаптавацца, а Бін Сінь – на ўнутраным свеце і сямейных сувязях. Акрамя таго, у творы Цёткі прадстаўлены і антыкаштоўнасці, якія выконваюць важную выхаваўчую функцыю.